ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
ад 30.06.2023 № 141

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення ў 2023 годзе рэспубліканскага конкурсу на лепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення ў 2023 годзе рэспубліканскага конкурсу на лепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі, прысвечанага Году міра і стварэння (далей – конкурс).

2. Мэтамі конкурсу з'яўляюцца выяўленне, матэрыяльная падтрымка і папулярызацыя культурных праектаў патрыятычнай тэматыкі (далей – культурны праект).

3. Арганізатарам конкурсу з'яўляецца Міністэрства культуры.

4. Конкурс праводзіцца ў перыяд з 10 ліпеня па 30 снежня 2023 г. па наступных намінацыях:

"Лепшы спектакль патрыятычнай тэматыкі";

"Лепшая канцэртная праграма, прадстаўленне патрыятычнай тэматыкі";

"Лепшы фільм патрыятычнай тэматыкі";

"Лепшы твор жывапісу патрыятычнай тэматыкі";

"Лепшы твор графікі патрыятычнай тэматыкі";

"Лепшы твор скульптуры патрыятычнай тэматыкі";

"Лепшы твор манументальнага, манументальна-дэкаратыўнага мастацтва патрыятычнай тэматыкі";

"Лепшая канцэртная праграма, спектакль, прадстаўленне непрафесійнага (аматарскага) калектыву мастацкай творчасці";

"Лепшая выстава народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (народных мастацкіх рамёстваў)";

"Лепшы інтэрактыўны клубны праект для моладзевай аўдыторыі";

"Лепшы інтэрактыўны музейны праект патрыятычнай тэматыкі";

"Лепшы інтэрактыўны бібліятэчны праект культурна-асветніцкай дзейнасці сельскіх бібліятэк";

"Лепшы інтэрактыўны бібліятэчны праект культурна-асветніцкай дзейнасці раённых і гарадскіх бібліятэк";

"Лепшы інтэрактыўны бібліятэчны праект культурна-асветніцкай дзейнасці абласных бібліятэк".

5. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калектывы аўтараў (не больш за 5 чалавек), а таксама калектывы работнікаў арганізацый культуры Рэспублікі Беларусь.

6. Культурныя праекты, прадстаўленыя ўдзельнікамі конкурсу, павінны адпавядаць наступным патрабаванням:

6.1. з'яўляцца творамі мастацтва ці культурнымі мерапрыемствамі, прысвечанымі гісторыі і культуры Беларусі, традыцыям, звычаям беларускага народа, важным падзеям сучаснага жыцця Беларусі, знакамітым суайчыннікам;

6.2. быць упершыню публічна абнародаванымі, выдадзенымі, апублікаванымі ў перыяд з 1 кастрычніка 2022 г. па 1 кастрычніка 2023 г.;

6.3. мець высокі прафесійны ўзровень;

6.4. вызначацца наватарствам і арыгінальнасцю ў раскрыцці патрыятычнай тэматыкі;

6.5. мець станоўчыя водгукі ў сродках масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь і (або) замежных краін, уключаючы інтэрнэт-рэсурсы.

7. Для ўдзелу ў конкурсе ўдзельнікі конкурсу прадстаўляюць у Міністэрства культуры ў перыяд з 1 кастрычніка па 14 лістапада 2023 г. у друкаваным і электронным выглядзе наступныя конкурсныя матэрыялы:

7.1. заяўка па форме згодна з дадаткам;

7.2. відэазапіс культурнага праекта ў электронным выглядзе, афішы, праграмкі, іншыя рэкламныя і інфармацыйныя матэрыялы культурных праектаў;

7.3. фатаграфіі на электронных (у фармаце JPEG, 300 dpi) носьбітах інфармацыі і (або) відэаматэрыялы (для твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва);

7.4. інфармацыю аб рэалізаваным культурным праекце, якая разам з іншымі звесткамі, павінна ўключаць яго апісанне, звесткі аб аўтары ці аўтарскім калектыве, звесткі аб абнародванні культурнага праекта, пералік водгукаў у сродках масавай інфармацыі;

7.5. спраўку-аб'ектыўку аўтара (ўдзельніка калектыву аўтараў); копію першай старонкі статута (палажэння) арганізацыі, калектыў работнікаў якой вылучаецца да ўдзелу у конкурсе, спраўку-аб'ектыўку кіраўніка арганізацыі культуры.

8. Конкурс праводзіцца ў два этапы.

9. На першым этапе вылучаюцца прэтэндэнты па намінацыях да ўдзелу ў другім этапе конкурсу.

10. Разгляд конкурсных матэрыялаў на першым этапе ў перыяд з 2 па 15 лістапада 2023 г. ажыццяўляюць адборачныя камісіі,

сфарміраванымі па намінацыях, не больш за 5 чалавек па кожнай намінацыі. Персанальны склад адборачных камісій зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры.

У склад адборачнай камісіі не маюць права ўваходзіць асобы, якія з'яўляюцца аўтарамі (сааўтарамі) пададзеных на конкурс культурных праектаў, кіраўнікамі арганізацый, якія падалі на конкурс культурныя праекты.

Рашэнне адборачнай камісіі прымаецца ў прысутнасці не менш паловы складу адборачнай камісіі адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў прысутных. Пры роўнай колькасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні адборачнай камісіі з'яўляецца вырашальным.

Рашэнне адборачнай камісіі афармляецца пратаколам, які падпісваецца ўсімі членамі адборачнай камісіі, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

11. Разгляд і ацэнка конкурсных матэрыялаў на другім этапе конкурсу ў перыяд з 16 лістапада па 12 снежня 2023 г. праводзіцца журы, сфарміраванымі па намінацыях, у складзе не больш за 7 чалавек па кожнай намінацыі. Персанальны склад журы зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры.

У склад журы не маюць права ўваходзіць асобы, якія з'яўляюцца аўтарамі (сааўтарамі) пададзеных на конкурс культурных праектаў, кіраўнікамі арганізацый, якія падалі на конкурс культурныя праекты.

12. Крытэрыямі адбору з'яўляюцца:

выкананне ўмоў і патрабаванняў да культурнага праекта, уключаючы правілы афармлення і падачы (прадстаўлення) конкурсных матэрыялаў;

адпаведнасць культурнага праекта прапанаванай тэматыцы;

высокі мастацкі ўзровень зместу і выканання твораў мастацтва культурнага праекта;

выкарыстанне арыгінальнага рашэння;

абнародаванне культурнага праекта на канцэртах, выставах, у тэатрах, кінатэатрах, сродках масавай інфармацыі і іншым чынам;

значнасць культурнага праекта для рэгіёна, колькасны склад удзельнікаў і аўдыторыі гледачоў.

13. Па выніках другога этапу конкурсу журы тайным галасаваннем вызначаюць пераможцаў па намінацыях.

14. Рашэнне журы прымаецца ў прысутнасці не менш паловы складу журы тайным галасаваннем простай большасцю галасоў прысутных. Пры роўнай колькасці галасоў "за" і "супраць" голас старшыні журы з'яўляецца вырашальным.

Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца ўсімі членамі журы, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

15. Вынікі конкурсу аб'яўляюцца шляхам апублікавання не пазней за 7 каляндарных дзён пасля прыняцця рашэння журы конкурсу на афіцыйным сайце Міністэрства культуры.

16. Пераможцы конкурсу атрымліваюць дыплом пераможцы і грашовую прэмію ў памеры 70 базавых велічынь, якая пералічваецца на разліковы рахунак пераможцы. У выпадках, калі пераможцай з'яўляецца калектыў аўтараў, кожны з удзельнікаў калектыву атрымлівае дыплом пераможцы, а грашовая частка прэміі дзеліцца паміж членамі аўтарскага калектыву ў роўных долях.

17. Фінансаванне выдаткаў па правядзенні конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжанных Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, а таксама за кошт іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
ў 2023 годзе рэспубліканскага
конкурсу на лепшы
культурны праект
патрыятычнай тэматыкі

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел у Рэспубліканскім конкурсе на лепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі**

Звесткі аб удзельніку конкурсу:

1. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку аўтара (аўтараў) культурнага праекта, назва арганізацыі культуры ў адпаведнасці са статутным дакументам) (на беларускай і рускай мове)

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

2. дата нараджэння аўтара (аўтараў) культурнага праекта, кіраўніка арганізацыі культуры

____________________________________________________________

____________________________________________________________

3. серыя, нумар, дата выдачы і орган, які выдаў пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь аўтара (аўтараў) культурнага праекта, кіраўніка арганізацыі культуры

____________________________________________________________

____________________________________________________________

Назва культурнага праекта____________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

Дата першага публічнага абнародавання культурнага праекта________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

Да ўдзелу ў якой намінацыіі (агульнай і прыватнай) вылучаецца

____________________________________________________________

____________________________________________________________

Пасада, ініцыялы, прозвішча, кантактныя звесткі (адрас, мабільны тэлефон, электронны адрас) аўтара, кіраўніка калектыва аўтараў, кіраўніка арганізацыі культуры ці ўпаўнаважанай ім асобы, якая ажыццяўляе падачу конкурсных матэрыялаў для ўдзелу ў конкурсе.